Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суды над актывістамі праходзяць на Берасцейшчыне, у Лідзе, Мазыры і Жлобіне дапоўнена

11.05.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода слова, свабода мірных сходаў

11 траўня па ўсёй краіне праходзяць суды над удзельнікамі акцый па “кармленні галубоў” ці сустрэч з блогерам Сяргеем Ціханоўскім. У 12 гарадах краіны судзяць актывістаў, журналістаў, праваабаронцаў і простых удзельнікаў сустрэч каналу “Краіна для жыцця”.



Поўны спіс затрыманых прыхільнікаў блогера Ціханоўскага і іншых актывістаў

Восьмага траўня ў Беларусі працягваюцца затрыманні і выклікі ў міліцыю прыхільнікаў затрыманага блогера Сяргея Ціханоўскага, а таксама тых, хто пачаў выходзіць па нядзелях на галоўныя плошчы сваіх гарадоў і карміць галубоў у знак салідарнасці з экалагічнымі актывістамі Брэста. Затрыманні не спыніліся і 9 траўня - людзей забіраюць з дамоў ці спыняюць па дарозе ў Бабруйск, дзе запланавана правядзенне "Антыпараду".

Берасцейшына

У Берасці ў гэты дзень плануецца як мінімум пяць судоў над працаўнікамі завода АКБ. Верагодна ў Кобрыне будуць судзіць і праваабаронцу “Вясны” Уладзіміра Вялічкіна, які знік пасля нядзельнай акцыі. Месца суда над затрыманым праваабаронцам Раманам Кісляком і актывістам Прафаюза РЭП Валерам Фамінскім высвятляецца.



Сяргей Пятрухін у судзе

Першым у суд Ленінскага раёна прывезлі затрыманага 6 траўня аднаго з лідараў пратэстаў у Брэсце, блогера **Сяргея Пятрухіна.** Першае пасяджэнне па яго справе адбылося ў пятніцу 8 траўня, але суддзя Дзмітрый Куроўскі перанёс разгляд справы на панядзелак.

На Пятрухіна складзены пратакол па ч. 1 арт. 23.34 КаАП – за ўдзел у берасцейскай акцыі па “кармленні галубоў” 19 красавіка і за тое, што вёў адтуль стрым.

Па словах адваката, падрыхтоўка справы да разгляду была праведзеная дрэнна, правы і абавязкі Пятрухіну не растлумачаныя. Блогер просіць вярнуць справу на дапрацоўку.

Суддзя адмовіў адвакату і Пятрухіну ў выкліку часткі сведкаў, бо яны сам іх не прывезлі. Пры гэтым задаволіў выклік тых, хто таксама затрыманы. У судзе перапынак для выкліку сведкаў.

Таксама Сяргей Пятрухін сказаў, што у яго тэмпература 37,3. Ён кажа, што разам ў ім у ізалятары былі людзі ў тэмпературай, да якіх прыязджала хуткая.

У выніку суддзя Куроўскі прыняў рашэнне **арыштаваць** Пятрухіна **на 15 сутак**.



24.	14-30	Антонюк Е.В. к Антонюк А.В.	О признании доли в праве собственности на общее имущество	Карпова Е.Ю.	153
25.	14-30	Чистова С.В. к Чистову С.Н.	О разделе жилого дома	Виноградова А.А.	154
26.	14-30	Малышенко Д.Б.	Ч.3 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь	Шурин Д.В.	280
27.	14-30	Вялов О.С.	Ч.3 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь	Шурин Д.В.	280
28.	14-30	Казак В.Н.	Ч.3 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь	Калина С.И.	279
29.	14-30	Калько Ю.В.	Ч.1 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь	Калина С.И.	279
30.	14-30	Дементинок В.В.	Ч.1 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь	Семенчук А.А.	377
31.	14-30	Остапук К.Г.	Ч.3 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь	Семенчук А.А.	377
32.	14-30	Мороз В.Н.	Ч.1 ст. 23.34 КоАП Республики Беларусь	Семенчук А.А.	377
33.	15-00	Свидунович И.Н. к Товстыка В.А.	О предост. рассрочки исполнения решения суда	Конючко А.В.	250
34.	15-00	Климович О.Н., Михнюк А.Н.	Ч.1 ст. 9.1 КоАП Республики Беларусь	Шурин Д.В.	280
35.	15-00	Доценко А.Ю. к Жуликовой А.В.	О взыскании долга по договору займа	Карпова Е.Ю.	153
36.	17-30	Веремчук В.Н.	Ст.23.4 КоАП Республики Беларусь	Куровский Д.Г.	156

Таксама ў судзе Ленінскага раёна пасля 14.00 па артыкуле 23.34 КаАП мусяць судзіць **Дзяніса Малышэнку, Алега Вялава, Юрыя Калько, Канстанціна Астапука, Уладзіміра Мароза, Віталя Казака і Уладзіміра Дземянціюка**. У спісе няма парваабаронцаў **Рамана Кісляка, Уладзіміра Вялічкіна і сябры Прафсаюза РЭП Валера Фамінскага**.

Суддзя **Аляксандр Семянчук** перанёс суды над **Уладзімірам Марозам і Кансанцінам Астапуком** на 12 траўня, бо яны хадайнічалі, каб суд даў ім час на пошук адваката. Аднак па выхадзе з суда абодвух актывістаў забрала міліцыя і павезла назад у ізалятар. Жонка Мароза хоча пісаць заяву аб выкраданні мужа.

Актывіста **Віталя Казака** судзіць суддзя **Святаслаў Каліна**. Яму таксама далі дзень на пошукі адваката. Суд працягнецца 12 траўня.

Юрыя Калько таксама судзіць Каліна. Юрыя даставілі ў суд з перабінтаванай рукой. Кажа, што падчас затрымання яму паламалі пальцы. Суддзя прыняў рашэнне аштрафаваць Калько у агульнай складанасці на 40 базавых велічыняў: 30 базавых - па арт. 23. 34 КаАП і 10 базавых - за непадпарадкаванне супрацоўнікам (арт 23.4 КаАП).



Юрый Калько ў калідоры суды

Дзяніс Малышэнка атрымаў **30 базавых велічынь штрафу (810 рублёў)**. Справу разглядаў суддзя **Дмітрый Шурын**. Па папярэдніх звестках пасля суда яго павезлі ў РАУС складаць новы пратакол.

Таксама **30 базавых велічынь (810 рублёў)** атрымаў **Алег Вялаў**. Ён на волі.

Суды ў Магілёве



У Магілёве пачынаюцца суды над затрыманымі актывістамі і журналістамі

У панядзелак, 11 траўня, пачынаюцца суды над затрыманымі на выходных і ў пятніцу актывістамі і журналістамі. Усіх затрымалі нібыта за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. Сярод тых, над кім чакаюцца суды ў Магілёве, — праваабаронца "Вясны" Аляксандр Буракоў, блогер Міхаіл Аршынскі, журналістБелаПАН Алесь Асіпцоў, грамадскія актывісты Андрэй Бодзілеў і Станіслаў Паўлінковіч і іншыя.

Ліда

У Лідзе каля дзесяці чалавек сабраліся ля суда, каб патрапіць на суд над **Паўлам Анціпкіным** – адзіным з шасці лідчан, якога не асудзілі ў пятніцу, а пакінулі ў ізалятары да панядзелка. Вядома, што затрымалі хворым. Тыя, хто падтрымліваў Паўла, дамагліся, каб Анціпкіну перадалі лекі ў ІЧУ.

Сваякі і іншыя людзі з самага ранку сядзелі ў чаканні суда, аднак пасяджэнне па справе Анціпкіна правялі тайна: нікогда не запрасілі, нічога сваякам не паведамілі. Павел Анціпкін, бацька 4 дзяцей, атрымаў максімальна магчымыя **15 сутак арышту**. Такое рашэнне вынес суддзя **Філатаў**.

Мазыр

У Мазыра мусяць судзіць трох затрыманых: адміністратара тэлеграм-суполкі "Мазыр для жыцця" **Аляксандра Цуканава, Вячаслава Удовенку,** актывіста **Уладзіміра Неўмяржыцкага.**

У судзе і РАУС, куда звярнуліся актывісты і родныя затрыманых, адказалі, што суды, магчыма, будуць пасля 14-00.

Па інфармацыі праваабаронцы **Уладзіміра Целяпуна**, Неўмяржыцкага, Удовенку і Цуканава былі складзены пратаколы па арт. 23.34 ч.1. (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве). Пасяджэнні адбываліся ў 14.30 адначасоваў розных залях суда. Вынікі: Неўмяржыцкі - **3 сутак** (ён фактычна іх адсядзеў) і **штраф 30 б.в.** Удовенка - **10 сутак** арышту, Александр Цуканаў - 15 сутак арышту па арт. 23.34 КаАП і ячшэ 10 за непавагу да суда **(агулам 25 сутак арышту)**.

Жлобін

Затрыманага ў пятніцу **Віталя Грыцкова** асудзілі на **15 сутак** за "актыўны ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве".

Суды на Віцебшчыне: Орша, Глыбокае, Полацк, Наваполацк, Віцебск



Суды ў Віцебскім рэгіёне: актывістам даюць суткі

3 раніцы 11 траўня па ўсёй краіне адбываюцца суды над затрыманымі ў пятніцу і за выходныя актывістамі і актывісткамі, які выходзілі на "кармленне галубоў" у сваіх гарадах ці сустракаліся з камандай блогера Сяргея Ціханоўскага. У Віцебскай вобласці пад пераслед патрапіла каля 25 чалавек, на якіх міліцыянеры склалі пратаколы за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах.

Інфармацыя будзе дапаўняцца

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY